**З успамінаў Ларысы Буранковай, выпускніцы 1971 года Брацькавіцкай СШ:**

Маё дзяцінства прайшло ў вёсцы Брацькавічы, якая стаяла на беразе хуткаплыннай рэчкі Дзяражні ў зялёным атачэнні лясоў і прыбярэжных лазнякоў, уздоўж дарог раслі кучаравыя вербы, да неба цягнулі свае галіны старыя ліпы і бярозы, каля дамоў раслі гонкія тапалі, кусты бэзу і язміну. Назва вёскі паходзіць ад слова “брат” або “браты”. У пісьмовых крыніцах ёсць успамін аб Брацькавіцкім мужчынскім манастыры.

Вёска Брацькавічы вядома з 16-га стагоддзя, як сяло дзяржаўнай уласнасці ў Мсціслаўскім ваяводстве Вялікага княства Літоўскага. У 1747 годзе тут дзейнічала прадпрыемства па вырабу паташу. У 19 стагоддзі сяло з’яўлялася цэнтрам воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1824 годзе памешчыца Я. Усакоўская заснавала ў маёнтку сукнавальню з гадавым доходам у 200 рублёў, меліся млын, карчма. У 1863 годзе была пабудавана праваслаўная Пакроўская царква, а ў 1864 годзе адкрыта народное вучылішча, якое было размешчана ў грамадскім доме. Першым настаўнікам, які працаваў у гэтым вучылішчы, быў Глінскі Андрэй Леанардавіч. Ён скончыў курс Магілёўскай духоўнай семінарыі. Законавучыцелем з’яўляўся Заркевіч Парфеній Паўлавіч.

На пачатку 20 стагоддзя, у 1909 годзе, у вёсцы налічвалася 72 двары, пражывала 519 жыхароў, тут размяшчаліся валасное праўленне, школа, бальніца, вадзяны млын, хлебазапасны магазін, казённая вінная лаўка, заезны дом.

Вёска размяшчалася на ўзгорках і была падзелена рэчкай на дзве часткі. Назвы вуліц указвалі на багатую гісторыю гэтага паселішча. Цэнтральная частка вёскі, дзе стаялі дзве крамы, сталовая, пункт бытавога абслугоўвання і клуб, называлася Брацькавічы. Далей дарога вяла на Пуцятаўку, а паралельна ёй, праз Крывялёўскі ручай, размяшчалася другая вуліца і называлася яна Крывель.

Вуліца, якая пачыналася за будынкам сельскага Савета, называлася Прылёпаўкай або Шляхтаю. Відаць, яна была заселена пазней іншых вуліц, і жылі там шляхцічы Падабеды. Вайноўскія і інш.

За рэчкай, пераехаўшы драўляны мост, пачыналася вуліца Ранда. Праз гэту вуліцу праходзілі два транспартныя шляхі: адзін паварочваў управа — гэта шлях на Маластоўку (Краснаполле), Прапойск (Слаўгарюд) і Чэрыкаў, а другі браў кірунак у левы бок і злучаў вёску з Калодзецкай, Сілічамі і Саматэвічамі. На гэтай вуліцы былі пабудаваны  заезны дом і карчма або ранда. Каля маста, што вядзе на Ранду, вясной рэчка разлівалася, выходзіла з берагоў і залівала пойму, утваралася возера, вада падыходзіла амаль да дарогі з аднаго боку, а з другого боку падступала возера, якое звалася Вальня. У рэчку ўлівалася тры ручаі Крывельскі, Блудзямскі і Данькін. Вясною, у час паводкі, цэнтральная частка Брацькавіч нібы акружана вадзяным поясам, відаць, тут і была заснавана вёска ў далёкія гады, на самым высокім месцы, акружаная водным ровам і рэчкай Дзяражняй. Першым пісьмовым дакументам, дзе ўпамінаецца вёска Брацькавічы, з’ўляецца ліст Крычаўскага

дзяржаўцы Андрэя Шалухі баярам Кашурам аб перадачы ім зямлі ў наваколлях Брацькавічаў, датаваны 25 мая 1552 года. У ім указваюцца назвы ваколіц і раўкоў вёскі: «... съ того пожару у равок Скалинский, тым равком у равок Хаминский,... съ того ручья через лазовку съ паны Подобедами через дорогу Блудямскую, з ровка у речку Кривель, Кривелём у верх у межу вывозом, где и присада Кошелевская на ту дорогу Блудямскую.»

Як вынікае з гэтага документа, 500 гадоў тому назад ручай Крывялёўскі быў рэчкай Крывель. а зараз гэты ручай упадае ў рэчку Дзяражню. Вось тут і быў райскі куток для купання брацькаўскай дзятвы, месца гэта называлася Абрыў.

Мае бацькі прыехалі ў Брацькавічы ў 1957 годзе. Хату пабудавалі на Рандзе, на месцы, дзе раней стаяла школа. але яна згарэла адразу пасля войны. Новую школу пабудавалі ўжо на Прылёпаўцы, у самым канцы вёскі, дзе раней быў, шпіталь або бальніца, якая згарэла ў вайну, бо там яго займалі паліцаі і немцы.

Бацька мой, Буранкоў Фёдор Герасімавіч, працаваў дырэктарам школы. Пад яго кіраўнітвам будаваліся два школьныя будынкі: адзін драўляны, а другі мураваны. Пасля того, як пабуваўся вялікі драўляны корпус, школа атрымала статус сярэдняй навучальнай установы. Раней вучні пасля сямігодкі працягвалі навучанне ў суседніх вёсках Вётухне і Савінічах. Першы выпуск Брацькавіцкай сярэдняй школы адбыўся ў 1966 годзе. Класы былі напоўнены, з 5 па 8 класы было па 2-3- класы. Пасля васьмігодкі многія паступалі вучыцца ў тэхнікумы і вучылішчы, таму 9 і 10 класы былі ўжо меншымі – па 18-20 вучняў.

Школьныя цудоўныя гады, колькі б часу не прайшло, але назаўсёды яны застануцца ў памяці, бо, менавіта, у школе пачыналася адкрыццё новага, нязведанага на ўроках, на школьных вечарынах, у турыстычных походах.

Дзякуючы адданай працы нашых настаўнікаў, выпускнікі нашай школы поступалі ў Мінскія ВНУ, ваенныя вучылішчы Калінінграда, Адэсы і іншых гарадоў Савецкага Саюза. Сярод выпускнікоў Брацькавіцкай школы Буранкоў Аляксандр — доктар фізіка-матэматычных навук, Ткачова Зоя — навуковы супрацоўнік інстытута фізікі, паэты і пісьменнікі, члены Саюза пісьменнікаў: Леўчанка Мікалай, Патапенка Віктар. Ваенныя вучылішчы закончылі Бардонаў Уладзімір Іванавіч, Серафімовіч Леанід Іосіфавіч, шмат нашых выпускнікоў з вышэйшай і спецыяльнай адукацыяй, якія зараз працуюць як у Беларусі, так і далёка за яе межамі.

Матэматыку ў нашай школе выкладалі некалькі настаўнікаў: у 5-8 класах Галаенка Сяргей Сямёнавіч, Адахоўская Лілія Антонаўна, у старэйшых класах працавалі Серафімовіч Іосіф Пятровіч і Брындзікава Соф'я Васільеўна. Рускую мову і літаратуру вялі настаўнікі Рубанова Клаўдзія Васільеўна, Літвінава Марыя Мікітаўна, Міхаленка Таццяна Апанасаўна. Беларускую мову і літаратуру выкладалі Буранкова Надзея Захараўна і Марчанка Зінаіда Гаўрылаўна. Гісторыю і геаграфію вывучалі пад кіраўніцтвам Ермакова Міхаіла Васільевіча, Стасенкі Пятра Уладзіміравіча, Чарадухі Аляксея Ананьевіча, Каранкевіч Люлмілы Данілаўны. Фізкультуру

выкладаў Падабед Міхаіл Іванавіч, потым ён вёў военную справу. Шмат добрага зрабіў настаўнік фізічнай культуры Курашоў Леанід Дзмітрыевіч.Пад яго кіраўніцтвам быў пабудаваны школьны стадыён з бегавымі дарожкамі, абсталяваны футбольныя і баскетбольныя пляцоўкі, праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы сярод класаў, удзельнічалі ў раённых спаборніцтвах і спартакіядах. У пачатковых класах праавалі Аўхачова Марыя Іванаўна і Пуцята Антаніна Пракопаўна. Да святочных канцэртаў рыхгавала выступленне школьнікаў Аўхачова Марыя Іванаўна. Добра спявалі Гаўрыленка Ніна і Дыбцава Надзя, Белаколенка Валодзя, іграла на гітары Клімантовіч Таіса, танцавальныя нумары і камічныя ролі добра выконвала Марыя Кротова.

На Новы год у школе праводзілі баль-маскарад. Зімовыя канікулы дзеці праводзілі на санках і лыжах, катаючыся з крутых спускаў на Дуброве, у кар'еры за нашай вуліцай Рандай. Самы круты трамплін быў на кар'еры, дзе летам бралі пясок будаўнікі. Пакараць гэтыя кручы з'язджаліся хлопцы і дзяўчаты з усіх вуліц, але лепшымі лыжнікамі былі, канешне, рандаўцы, бо на спусках і пад'ёмах няпростай лыжні яны праводзілі больш часу.

Наша пакаленне будзе памятаць сваю вёску жывой і прыгожай у любую пару года, бо там засталося наша юнацтва, там прайшлі нашы лепшыя гады.